# НЯМЕЦКА-ЛІЦВІНСКІЯ АРХІТЭКТУРНЫЯ СУВЯЗІ XIII-XV стст

А.М. Кушнярэвіч,
*г. Мінск, БДПУ*

Упершыню пэўныя сувязі нямецкай архітэктуры ў беларуска-літоўскім дойлідстве прасачылі польскія даследчыкі Г.Вараб'еў, М. Сакалоўскі, а таксама нямецкія П. Вэбэр і А. Іпэль. Пачынальнік беларускага мастацтвазнаўства М. Шчакаціхін таксама цікавіўся гэтай праблемай і лічыў, што пад уплывам нямецкага сярэднявечнага мастацтва беларуская архітэктура пайшла шляхам готыкі, захаванай тут да XVII ст.[1]. Пэўныя уплывы нямецкай готыкі на станаўленне дойлідства Беларусі і Літвы адзначылі такія вядомыя даследчыкі гэтых краін, як Н. Высоцкая, Т.Габрусь, А. Трусаў, М.Ткачоў, А. Янкевічэне, С. Абрамаускас, В. Левандаускас, Н. Кіткаускас і інш. У выніку прац вышэй згаданых навукоўцаў назапашаны багаты і разнастайны матэрыял, які патрабуе пэўнага аналізу і абагульнення.

Вялікую ролю ў працэсе распаўсюджвання здабыткаў архітэктуры лацінскага Захаду адыграла з'яўленне ў беларускіх гарадах у XIIст. нямецкіх гандляроў. У XIII ст. Полацкая зямля ўжо мела развітыя гандлёвыя сувязі з ганзейскімі гарадамі Рыгай, Гданьскам, Растокам, Любекам, Кёльнам і іншымі факторыямі. Аднак купцы полацкай зямлі, а таксама Смаленска мелі свае прадстаўніцтвы ў Рызе значна раней, дзе ў 1212-1234г. узнік рускі двор і была пабудавана царква Св. Мікалая, а таксама складскія памяшканні[2]. У першай палове XIII ст. нямецкімі купцамі быў узведзены касцёл у Полацку. У адрозненне ад Ноўгарада тут яны жылі асела, наймаючы жылыя памяшканні ў палачан. Падобны лад жыцця , як справядліва адзначае І. Ганецкая, не мог не прывесці да шчыльных культурных кантактаў з мясцовым насельніцтвам[3]. У Віцебску таксама функцыяніравала нямецкая гандлевая кантора і быў, напэўна, пабудаваны каталіцкі храм[4].З канца XIV ст. купцы з Гародні, Бярэсця, Полацка свабодна наведвалі многія нямецкія гарады. У гэты час абшчыны немцаў існавалі ў Полацку, Вільні, Бярэсці, Гародні, а ў Рызе пастаянна альбо сезонна жыло многа беларусаў, якія мелі там сваю царкву, вуліцу, дамы. Да 1410г. тысячы русінаў перамяшчаліся на жыхарства ў Прусію як палонныя. Шмат было таксама добраахвотных перасяленцаў. З XV ст. у нямецкіх універсітэтах пачалі вучыцца студэнты з Беларусі[5]. Безумоўна, такія актыўныя і рознабаковыя культурныя кантакты вельмі садзейнічалі распаўсюджванню нямецкіх архітэктурна-будаўнічых прыёмаў у дойлідстве Вялікага Княства Літоўскага.

Таму буйнапамерная цэгла, якая шырока выкарыстоўвалася пры ўзвядзенні замкаў XIV ст. Беларусі і Літвы, хутчэй за ўсе трапіла сюды з Германіі праз Лівонію і Польшчу. Яе змаглі завезці ганзейскія майстры, якіх у 1323г., скарыстаўшы часовае перамір'е з Ордэнам, запрасіў праз рыжскіх гандляроў вялікі князь Гедымін, што ў гэты час актыўна ўмацоўваў заходнія межы Вялікага Княства Літоўскага.

Сведчаннем уплываў нямецкай архітэктуры на беларуска-літоўскае дойлідства з'яўляюцца замкі першай паловы XIVст. у Лідзе, Крэве, Медніках, падобныя сваёй кампазіцыяй да рыцарскіх замкаў тыпу "кастэль", якіх шмат было пабудавана Ордэнам у Паморʼі, Прусіі. У гэты час фартыфікацыйнае майстэрства крыжакоў было на самым высокім узроўні ў Еўропе[6], таму не дзіўна, што вялікія князі літоўскія, ствараючы дасканалую на той час сістэму абароны дзяржавы выкарысталі вопыт іх мілітарнага будаўніцтва.

Вядома, што спачатку крыжацкія замкі мелі полігнальную форму плана. Аднак замак у Мальборку, які пачалі будаваць у 1275г., ужо меў план блізкі да квадрата. Такую схему абарончых умацаванняў крыжакі запазычылі з араба-сірыйскай архітэктуры, якая акумуліравала антычныя традыцыі рымскіх і візантыйскіх абарончых абозаў.[7] Блізка да аднаго з кутоў замкаў недалёка ад уваходу, асобна ад муроў стаяла вежа, якая дазваляла кантраляваць подступы да яго з напольнага боку, а на выпадак актыўных баявых дзеянняў служыла пунктам апошняй абароны. У канцы XIII ст. гэту вежу будавалі ў адным з кутоў з напольнага боку у перавязь з мурамі. Часцей за ўсё гэта вежа была ў аснове чатырохграннай, а затым пераходзіла ў васьмярык, альбо мела толькі васьмігранную форму. Многія замкі польскага караля Казіміра Вялікага таксама мелі вежы аналагічных форм [Рава, Баляславіц над Проснай, Крушвіца і інш.] . Уваход размяшчаўся высока над узроўнем дзядзінца. Таму звонку ўнутр вежы можна было трапіць альбо па прыстаўной лесвіцы, ці з баявой галерэі, якая была ў завяршэнні сцен. У верхняй частцы вежы звычайна была камора, з якой крыжакі ў час небяспекі давалі сігнал агнём альбо дымам

гарнізону суседняга замка. Гэты сігнал можна было заўважыць, бо звычайна іх замкі, як сведчаць помнікі, узведзеныя ў Хэльмінскай зямлі і Гданьскім памор'і, знаходзіліся недалёка адзін ад аднаго. Так, напрыклад , ад Гданьска да Торуні яны размешчаны ўздоўж Віслы з такім разлікам, што адлегласць паміж імі складае каля дзесяці кіламетраў. У выніку быў выпрацаваны шырока распаўсюджаны ў архітэктуры крыжакоў XIV ст. тып аднавежнага замка, які меў план правільнай формы. Цікава, што на поўдні Польшчы ў гэты час у асноўным былі распаўсюджаны замкі з няправільная формай плана[8].

На гэтым архітэктурным фоне вельмі цікавай выглядае эвалюцыя замкаў кастэляў Беларусі і Літвы, асабліва ў выніку апошніх археалагічных даследванняў. Так, у працэсе раскопак Крэўскага замка, праведзенных М. Ткачовым, А. Трусавым, І. Чарняўскім, А. Дзярновічам устаноўлена, што ў пачатку XIV ст. быў узведзенны няправільны ў плане чатарохкутнік абарончых муроў.[9] Праз кароткі тэрмін на паўночным рагу замка дойліды збудавалі Княжацкую вежу, а насупраць – у паўднёвым куце - яшчэ адну невялікую па памерах вежу. Спачатку ў гэтых вежах, як і ў большасці замкаў крыжакоў XIV ст., не было мураваных сходаў, а толькі прыстаўныя драўляныя лесвіцы, якія злучалі паміж сабой іх ярусы. Вышэй згаданыя даследчыкі выказалі меркаванне, што першапачаткова майстры ці зусім не збіраліся будаваць вежаў, ці планавалі іх узвесці пазней у кутах унутры. На нашу думку, дойліды атрымалі спачатку загад, напэўна, узвесці толькі адну вежу ўнутры замка, непадалек ад колішняй брамы. Там, падчас архітэктурна-археалагічных даследванняў 1989 г., былі выяўленны падмуркі амаль квадратнага ў плане будынка пачатку XIV ст. Яго функцыянальнае прызначэнне даследчыкі вызначалі як княскі палац, падлога у якім была выбрукавана з невялікіх каменняў. Па характары муроўкі, сцены гэтага збудавання цалкам аналагічныя замкавым. Куты яго, як і найбольш складаныя канструкцыйныя элементы, узводзілі з цэглы. Уваходны тамбур размешчаны збоку паўночна-заходняга абарончага мура, быў таксама цагляны. Будынак, верагодна, меў два паверхі.[10] Аднак наўрад дойліды пачалі б узводзіць палац, не закончыўшы будаўніцтва галоўных замкавых умацаванняў – абарончых вежаў. Відаць, яго аналагамі, як адзначаюць далей навукоўцы, выступалі жылыя будынкі на княжацкіх падворках у Полацку і Навагрудку. Не адмаўляючы гэтых меркаванняў, усе ж такі, ва ўмовах новых архітэктурных тэндэнцый і ўзаемаўплываў XIVст., напэўна, прасцей было б палац прыбудаваць да аднаго з замкавых муроў, як гэта, напрыклад, было зроблена ў шэрагу каралеўскіх замкаў Польшчы канца XIII-XIV ст.ст.[11] Вежу ўнутры замка маглі значна пашкодзіць крыжакі ў час аднаго са сваіх нападаў. Гэтаму меркаванню не супярэчаць вынікі даследаванняў М. Ткачова, які ўстанавіў, што яны гэта зрабілі ў хуткім часе пасля яго будаўніцтва[12] Магчыма, узвядзенне вежы не паспелі закончыць дойліды, альбо пасля аднаўлення яе прыстасавалі пад жылую пабудову.

Цікавай была таксама гісторыя будаўніцтва Лідскага замка, узвядзенне якога прыпадае на 30-я гады XIVст. Яго архітэктрура, як і Крэўскага, сведчыць, што тутэйшыя дойліды разам з запрошанымі іншаземнымі майстрамі, узяўшы за узор рыцарскі кастэль, прыстасавалі гэты тып абарончага збудавання да мясцовых патрэб. Яны значна павялічылі плошчу замкавага двара, дзе ў час небяспекі маглі знайсці прытулак не толькі войскі, але і мірнае насельніцтва. Акрамя таго імі былі выкарыстаны найбольш распаўсюджаныя ў мясцовым драўляным абарончым дойлідстве вежы чатырохграннай формы. У выніку дойліды выявілі не толькі ўсебаковае веданне дасягненняў еўрапейскай фартыфікацыі, але і мясцовых будаўнічых традыцый. Спачатку замак меў толькі адну вежу ў паўднёва-заходнім куце двара, якая мела ахоўнае і жылое прызначэнне. Муры, як і ў Крэўскім замку, завяршаліся баявой галерэяй. У канцы XIV-пачатку XV ст. па загаду вялікага князя Вітаўта ў замку была ўзведзена ўпрытык да муроў другая, паўночна-ўсходняя вежа з разлікам на вядзенне гарматнага бою.[13] У гэты час адбывалася будаўніцтва новых і актыўная мадэрнізацыя раней ўзведзеных замкаў як у ордэнскай архітэктуры, так і ў Вялікім Княстве Літоўскім і Кароне Польскай, што было звязана не толькі з увядзеннем агнястрэльнай зброі, але і з актыўнай іх падрыхтоўкай да рашаючых баявых дзеянняў.

Адным са сведчанняў інтэграцыі сярэднявечнай культуры Беларусі і Літвы ў еўрапейскую з'яўляецца таксама замак у Троках, які да 1535г. быў рэзідэнцыяй вялікіх князеў літоўскіх. Помнік ўяўляе сабой пераходны тып пабудовы ад замка да палаца. Гэты фартыфікацыйны комплекс складаецца з дзвюх частак: прадзамкавай і рэзідэнцыі вялікага князя, якая была ўзведзена на востраве Гальве і аддзелена ад першай часткі каналам. У прадзамкавай часцы на рагах сцен былі ўзведзены моцна высунутыя за іх знешні контур вежы цыліндрычнай формы, якія ў аснове былі чатырохкутнай формы. У цэнтры

паўднёва-заходняй сцяны была пастаўлена праезжая вежа-брама. З унутранага боку гэтай часткі размяшчаліся двухпавярховыя казематы. Рэзідэнцыя вялікага князя была з чатырох бакоў абнесена мурамі, якія ў плане ўтвараюць чатырохкутнік амаль правільнай формы. Асобныя іх праслы былі ўмацаваны контрфорсамі, што таксама часта ўжываліся ў замках Польшчы (Сабешыў, Радзынь, Аполь, Кола, Лякно і інш). У цэнтры замкавага двара былі пабудаваны паралельна адзін другому два трохпавярховыя жылыя карпусы. Зала аднаго з карпусоў, якая займала ўвесь другі паверх, была перакрыта зорчатымі скляпеннямі і распісана фрэскамі. У вокны былі ўстаўлены вітражы . Ваконныя адхоны акцэнтоўвала цэгла ў выглядзе валіка. Палацы дойліды злучылі паміж сабой драўлянай галерэяй. Другім вельмі важным рэпрэзентацыйным элементам як Трокскага, так і аналагічнага яму тыпу замкаў была праезжая вежа-брама. Яе архітэктанічнае вырашэнне і дэкаратыўнае афармленне падкрэслівала іерархічнае становішча ўладальніка замка.[14]

Замак у Троках яскрава ілюстроўвае працэс станаўлення ў архітэктуры другой паловы XIV-XVстст. Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы новага тыпу рыцарскіх замкаў, у якіх сумяшчаліся мілітарныя, жылл'ёвыя і адміністрацыйныя функцыі. Такі тып замка сустракаецца ў дойлідстве Вялікай Польшчы, Куяў, што развіваліся пад моцным уплывам крыжацкай архітэктуры, а таксама ў Сілезіі (Лешніца, Худаў). Для сілезскіх замкаў, як і Трокскага, уласціва высокая праезжая вежа-брама стройнага сілуэта. У Заходнім Памор'і такія вежы працягвалі будаваць ў першай палове XVI ст. (Вышын, Добрая, Познань). Польскі даследчык М. Марэлоўскі лічыў, што Трокскі замак узведзены пад уплывам французскіх і нідэрландскіх помнікаў абарончага дойлідства (Вайленрод, Косы, М'юдэн), а таксама крыжацкага замка ў Швэцю.[15]

З аналізу планіровачнай структуры Трокскага замка вынікае, што самым блізкім яму аналагам з'яўляецца замак у Ліве, што ў Мазовіі. Гэтыя помнікі аб'ядноўвае прамавугольны план з вежай-брамай на восі сіметрыі і дварам у цэнтры, па баках якога былі ўзведзены жылыя памяшканні аднолькавай шырыні. Для іх характэрны і блізкія памеры дзядзінцаў: 32х33м у Ліве і 33х37 у Троках. Цікава, што гэты замак быў узведзены вялікім князем Вітаўтам у хуткім часе пасля наведвання ў 1400г. яго жонкай смаленскай княжной Ганнай Мальборкскага замка, дзе яна была прынята вялікім магістрам. Магчыма, менавіта адтуль былі запрошаны ў Трокі нямецкія майстры- дойліды. Заслугоўвае ўвагі той факт, што князь Януш Мазавецкі, які з'яўляецца фундатарам узведзеных пазней, чым Трокскі, замкаў у Ліве і Цеханаве, быў жанаты на дачцэ вялікага князя Кейстута і сястры вялікага князя Вітаўта Ганне Дануце. Не выключана, што падабенства гэтых замкаў было ў значнай ступені абумоўлена дынастычным шлюбным саюзам, які спрыяў выбару за ўзор Янушам Мазавецкім Трокскага замка. Магчыма, ім былі запрошаны ў Ліў, а затым Цеханаў яго майстры-дойліды. Узвядзеннем жа гэтых двух помнікаў кіраваў нямецкі архітэктар Нікляс. Не выключана, што ён таксама ўзначальваў будаўніцтва Трокскага замка, які з'яўляецца важным сведчаннем уплываў абарончага дойлідства Вялікага Княства Літоўскага на архітэктуру Кароны Польскай.

У апошняй чвэрці XIV-пачатку XVст у крыжацкай архітэктуры польскага Памор'я, Прусіі атрымалі распаўсюджванне замкі, якія ў плане мелі геаметрычна правільную форму. На кожным з чатырох рагоў стаялі фланкіруючыя пераважна цыліндрычнай формы вежы, што мелі байніцы, прыстасаваныя да ручной агнястрэльнай зброі.[16] Прыкладам такой фартэцыі ў архітэктуры Беларусі і Літвы з'яўляецца замак у Коўна, які пасля перабудовы канца XIV-пачатку XVст. меў план чатырохвугольнай формы. На рагах замка былі ўзведзены вежы чатырохвугольнай і круглай у плане формы, а вакол яго быў выкапаны роў, што складаў дадатковую лінію ўмацаванняў.

Уплывы нямецкай архітэктуры зведала таксама культавае дойлідства Вялікага Княства Літоўскага. Адным з прыкладаў гэтага з'яўляецца кафедральны сабор у Вільні другой паловы XIII-пачатку XIVст.

Асноўны аб'ём помніка меў план квадратнай формы (22,7х22,4), з усходу да яго прымыкаў прэсбітэрый, які заканчваўся гранёнай апсідай. Каля паўночнай сцяны прэсбітэрыя была пабудавана сакрысція. На восі сіметрыі заходняга фасада стаяла шматярусная вежа . Аналагічнае размяшчэнне вежы прасочваецца ў помніках канца XII-XV ст ст. Новай Мархіі, Мекленбургіі, Готланда, Вестфаліі.[17]

1387-1388гг. пасля паўторнага хрышчэння Літвы, над рэшткамі храма , які быў моцна пашкоджаны ў час пажара, а затым разбураны, быў узведзены новы кафедральны

сабор пад назвай Св. Станіслава і св. Уладзіслава. Яго план адпавядаў плану першапачаткова ўзведзеннага сабора.

Сабор быў вельмі пашкоджаны пажарам 1419 г. Па загаду вялікага князя Вітаўта, у сувязі з яго плануемай каранацыяй, быў уведзены вялікі трохнефны гатычны сабор агульнай даўжыней 62 м., шырыней 28 м.[18]

Прататыпам гэтага помніка з'яўляецца кафедральны сабор у Фрамборку.[19] У адхонах і пераплетах вокнаў была ўжыта цэгла, тарцы якой былі ўпрыгожаны раслінным арнаментам.[20] Цэгла з такім арнаментам, а таксама жывёльным, дастаткова часта выкарыстоўвалася ў помніках паўночнанямецкай готыкі[21]. Гэтая цэгла была завезена ў Вільню яе майстрамі, якія, безумоўна, удзельнічалі ў будаўніцтве сабора.

Уяўленне аб крыніцы творчых імпульсаў у архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага папаўняюць вынікі археалагічных даследаванняў В.Таўтавічусам паўночнага схіла замкавай гары ў Вільні, дзе былі выяўлены рэшткі ўныпрызамкавага касцёла Св. Ганны канца XIV – пачатку XV ст ст. Помнік знаходзіўся ў паўночна-усходняй частцы Ніжняга замка ў Вільні на адлегласці каля двухсот метраў на паўночны усход ад кафедры. Гэта была мураваная аднанефная гатычная пабудова (20,5х9м) з прэсбітэрыям, што заканчваўся гранёнай апсідай . Пастаўлена на месцы драўлянага касцёла пад уплывам гатычнай архітэктуры Прусіі, Лівоніі.[22]

Такім чынам, на станаўленне мілітарнага і сакральнага дойлідства Вялікага Княства Літоўскага вялікі ўплыў аказала архітэктура Паўночнай Германіі, якая адыграла выключную ролю ў развіцці самабытных форм так званай "цаглянай готыкі". Адгэтуль яе кампазіцыйныя і канструкцыйныя прыёмы распаўсюджваліся ўздоўж балтыйскага ўзбярэжжа праз ганзейскія гарады і ордэнскія уладанні ў Прыбалтыцы ў архітэктуру Літвы і Беларусі.


[1] Шчакацін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Менск 1928. с.220-221

[2]Гурын М.Ф.,Бекцінееў Ш.І. Гандлевыя сувязі Полацкай зямлі//Гістарычна-археалагічны зборнік. 1998 .№12.с.69.

[3] Ганецкая І.У. Беларуская культура XI-XIIIст.ст. у агульнаеўрапейскім кантэксце//Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя.Мн., 1998. с.368.

[4] Бубенька Т.С.Вынікі вывучэння гандлева-рамеснага пасада раннесярэднявяковага Віцебска (1981-1989)//Гістарычна-археалагічны зборнік. Мн.,1993. ч.1с.37; Abraham W. Powstanie organizacji kościola Lacińskiego na Rusi.Lwów,1904.s.47.

[5] Сагановіч Г. Сярэднявечная Беларусь і немцы:сустрэча культур//Гістарычная навукова і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця. Матэрыялы II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў.Мн., 1999.с.47.

[6] Piskadlo A. Grody,zamki,fortece. Budownictwo i architektura obronna do schylku średniowiecza. Warszawa,1997.s.323.

[7] Mieobędzki A. Zamek w Mokrsku Górnym I niektóre problemy Malopolskieej architektury XV I XVI wieku.// Biuletun Historii sztuki. Warszawa,1959.R.XX.№1.s.43-44.

[8] Guerquin B.Zamki w Polsce. Warszawa,1974.s.50.

[9] Дзярновіч А.І., Трусаў А.А.,Чарняўскі І.М., Лес Крэва. Мн., 1993.с.33-35.

[10]Тамсама, с.35

[11] Architektura gotycka w Polsce. Katalog zabutków/ Pod red. T. Mroczko, M. Arszyńskiego. Warszawa, 1995.t2. s.25.

[12] Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн., 1987.с.44.

[13] Трусаў А.А. Старадаўніх муроў Адраджэнне.Мн..1990.с.21.

[14] Dutkiewicz J. Materialy źrydlowe do budouwy murow obronnych Tarnowa//Rocznik historii sztuki.1956.№ 1. s.270.

[15] Morelowski M. Wschód I Zachód w zamku trockim//Prace I materialy sprawozdaweze Sekcji Historii Sztuki Towarzystwa Przyjaciól Nauk w Wilnie. Wilno, 1935. t.II.s.320

[16] Domańska H.Z. Badań nad problemem przystosowania zamków Pomorza Wschodniego do broni palnej w latach 1390-1520//Kwartalnik architektury i urbanistyki. 1976. R. XXI.z.4.s.328.

[17] Jarzewicz J. Gotycka architektura, Nowej Marchii. Budownictwo sakralne w okresie Askańczyków I Wittelsbachów.Poznań, 2000. s.59-61.

[18] Kitkauskas N. Vieniaus pilys. Statyba ir architektura. Vilniaus, 1989. s.210.

[19] Китйкаускас Н. Вильнюский Кафедральный собор. Вильнюс, 1987.с.15.

[20] Kitkauskas N. Vilniaus pilys. Statyba ir architektura. S.20-22.

[21] Ober M. Mittelalterliche Dorfkirchen des südlichen Ostseeraumes als künstlerisches//Kościol i sztuka pobrzeża Baltyku. Pod. Red. M. Woźnidk Toruń, 1998, s.22.

[22] Tautavičius A. Vilniaus pilies teritorijos archeologiniai klausinejmai // LTSR valstybinės architektūros paminklu apsaugos inspekcijos metraštis. Vilniaus, 1960.t.2.s.18-20.